МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МІЖНАРОДНЫ ФОНД ЯНКІ КУПАЛЫ

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

МІЖНАРОДНЫЯ КУПАЛАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

# "ЯНКА КУПАЛА І "НАША НІВА"

(да 90-годдзя з дня заснавання газеты)

## ПРАГРАМА-ЗАПРАШЭННЕ

Шаноўны спадар Алесь Віктаравіч Бялацкі

Запрашаем Вас узяць удзел у Купалаўскіх чытаннях, якія адбудуцца 7-8 кастрычніка 1996 года ў Мінску ў памяшканні Літаратурнага музея Янкі Купалы (г.Мінск, вул. Янкі Купалы, 4)

## ЯНКА КУПАЛА

### *"НАШАЙ НІВЕ"*

*Не загаснуць зоркі ў небе,*
*Покі неба будзе, --*
*Не загіне край забраны,*
*Покі будуць людзі.*

*Ночка цёмная на свеце*
*Вечна не начуе;*
*Зерне, кінутае ў ніву,*
*Ўсходзіць ды красуе.*

*Наша зерне -- нашы думкі --*
*Не загінуць свету,--*
*Бліснуць краскай непаблеклай*
*Вечных агняцветаў.*

*З добрых думак, што мы кінем*
*На сваім дзірване,*
*Будзе ўнукам нашым жніва --*
*Доля, панаванне.*

*Беларускаю рукою*
*Светлай праўды сіла*
*Славу лепшую напіша*
*Бацькаўшчыне мілай.*

*Зацвіце яна, як сонца*
*Пасля непагоды,*
*Ў роўнай волі, ў роўным стане*
*Між усіх народаў.*

*Не загіне край забраны,*
*Покі жывы людзі,--*
*Не загаснуць зоркі ў небе,*
*Покі неба будзе!*

1911 г.

**РЭГЛАМЕНТ ПРАЦЫ:**

| | |
|---|---|
| даклады - | да 15 хвілін |
| паведамленні - | да 10 хвілін |
| выступленні ў дыскуссіі - | да 5 хвілін |

## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КАНФЕРЭНЦЫІ

***6 кастрычніка 1996 года**, нядзеля.*

Прыезд іншагародніх удзельнікаў Купалаўскіх чытанняў, рэгістрацыя іх ( у памяшканні Літаратурнага музея Янкі Купалы ), пасяленне ў гасцініцы. Знаёмства з Літаратурным музеем Янкі Купалы.

***7 кастрычніка 1996 г.**, панядзелак.*

9.00-10.00 Рэгістрацыя ўдзельнікаў Купалаўскіх чытанняў.
10.00-10.15 Адкрыццё Купалаўскіх чытанняў.
Уступнае слова сустаршыні аргкамітэта Купалаўскіх чытанняў прафесара **Вячаслава Рагойшы**.

Прывітанні :
- дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы, сустаршыня аргкамітэта Купалаўскіх чытанняў **Жана Дапкюнас**
- намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь **Валерый Гедройц**
- першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, прафесар **Пётр Брыгадзін**.

10.15-14.30 Выступленні з дакладамі і паведамленнямі. Дыскусія.

14.30 Адкрыццё выставы "Не згаснуць зоркі ў небе". Да 90-годдзя "Нашай Нівы".

15.00 Сумеснае пасяджэнне Рады Міжнароднага фонду Янкі Купалы, Фонду Райніса і Аспазіі.

17.30 Вечарына сучаснай латышскай літаратуры.

Ладзяць: Міжнародны фонд Янкі Купалы, Фонд Райніса і Аспазіі, Таварыства "Беларусь -- Латвія" ( у памяшканні Беларускага Таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Мінск, вул.Захарава, 28).

***8 кастрычніка 1996 г.**, аўторак.*

9.00-14.30 Выступленні з дакладамі і паведамленнямі. Дыскусія.

14.30-16.00 Полудзень.

16.00-18.00 Заключнае пленарнае пасяджэнне.
Закрыццё Купалаўскіх чытанняў.
Прынятще падсумавання.

**ПРАГРАМА ВЫСТУПЛЕННЯЎ**

***7 кастрычніка 1996 г.***
10.15-14.30

Старшынствуюць:
дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы **Жанна Дапкюнас** (Беларусь), прафесар **Аляксандр Баршчэўскі** (Польшча).

**Алег Лойка**, член-карэспандент АНБ, прафесар, загадчык кафедры БДУ
*"Янка Купала і "Наша Ніва" (да гісторыі трактовак).*

**Аляксей Каўка**, доктар філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута сусветнай літаратуры імя М.Горкага (Расія, Масква)
*"Наша Ніва" ў святле агульнабеларускага самасцвярджэння".*

**Янка Запруднік,** доктар філасофіі (ЗША, Нью-Ерк)
*"Купаліяна беларускай эміграцыі".*

**Анатоль Вярцінскі,** пісьменнік.
*"Наша Ніва" як школа грамадскага сталення Янкі Купалы".*

**Віктар Каваленка**, акадэмік АНБ, прафесар, дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АНБ
*"Сацыяльная воля чалавека і гістарычны час у літаратуры нашаніўскай пары ("Магіла льва" Янкі Купалы, "Антон" М.Гарэцкага).*

**Мечыслаў Яцкевіч**, доктар філалогіі габілітаваны, прафесар Вышэйшай педагагічнай школы (Польшча, Ольштын)
*"Польская літаратура на старонках "Нашай Нівы" 1906-1910гг."*

**Міхась Мушынскі**, член-карэспандэнт АНБ, прафесар, загадчык аддзела Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АНБ
*"Наша Ніва" і станаўленне беларускай літаратурнай крытыкі".*

**Генадзь Праневіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта
*"Наша Ніва" і нацыянальна-вызваленчы ідэал у творчасці Янкі Купалы".*

**Уладзімір Конан**, доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык аддзела Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра ім Ф.Скарыны
*"Літаратурная палеміка ў "Нашай Ніве: Янка Купала і Вацлаў Ластоўскі".*

**Валянцін Грыцкевіч**, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Санкт-Пецярбургскай акадэміі культуры
*"Пецярбург на старонках "Нашай Нівы".*

**Павел Навойчык,** выкладчык БДУ
*"Янка Купала -- рэдактар "Нашай Нівы".*

**Ганна Запартыка**, дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва
*"Рэдакцыйны архіў "Нашай Нівы" за 1906-1915 гг."*

**Віталь Скалабан**, кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы
*"Усенародны Сход": мастацкі вобраз і гістарычная рэальнасць".*

Заяўленыя выступленні ў дыскусіі:
**Раман Лубкіўскі** (Украіна), **Альфрэд Майхровіч** (Мінск), **Вітаўт Кіпель** (ЗША), **Арніс Мугурэвічс** (Латвія), **Вольга Казлова** (Мінск), **Паліна Вашко** (Мінск).

***8 кастрычніка 1996 г.***
9.00-14.30

Старшынствуюць: прафесар **Алег Лойка** (Беларусь), дацэнт **Лілія Плыгаўка** (Літва).

**Аляксей Пяткевіч**, кандыдат філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы
*"Нашаніўскія паплечнікі Янкі Купалы з Гродзеншчыны".*

**Аляксандра Станкевіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны
*"Роля "Нашай Нівы" ў фармаванні навукова-тэрміналагічнай і лексічнай сістэмы беларускай мовы".*

**Арсень Ліс**, доктар філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік АНБ
*"Аляксандр Уласаў -- рэдактар "Нашай Нівы".*

**Віктар Красней**, кандыдат філалагічных навук, прафесар БДУ
*"Літаратурная тэрміналогія ў публікацыях "Нашай Нівы".*

**Алена Ермакова**, аспірантка Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны
*"Аб некаторых прыёмах экспрэсізацыі (на матэрыяле малых публіцыстычных жанраў "Нашай Нівы").*

**Лола Званарова**, кандыдат філасофскіх навук (Расія, Масква)
*"Руская літаратура на старонках "Нашай Нівы".*

**Сяргей Харэўскі**, рэдактар незалежнага штотыднёвіка "Наша Ніва"
*"Станаўленне пераемнасці "Нашай Нівы".*

**Таццяна Кабржыцкая**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт БДУ
*"Украінская літаратура на старонках "Нашай Нівы".*

**Лілія Плыгаўка**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчыца кафедры беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры Вільнюскага педагагічнага універсітэта
*"Наша Ніва"і традыцыя народна-дыялектнай мовы".*

**Аляксей Майсейчык**, кандыдат філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта
*"Наша Ніва" і культурна-асветніцкі рух на Берасцейска-Пінскім Палессі".*

**Людміла Мінакова**, аспірантка Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны
*"Транспартная лексіка на старонках "Нашай Нівы".*

**Вячаслаў Рагойша**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры БДУ
*"Нашаніўскія скрыжаванні: Янка Купала і Сяргей Палуян".*

**Тэрэза Голуб**, намеснік дырэктара Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры
*"Наша Ніва" у лёсе і творчасці Максіма Гарэцкага".*

**Язэп Янушкевіч**, кандыдат філалагічных навук, загадчык аддзела Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь
*"Вацлаў Ластоўскі і "Наша Ніва".*

**Усевалад Рагойша**, выкладчык БДУ
*"Алесь Гарун і "Наша Ніва".*

**Фаіна Ваданосава**, загадчык аддзела Літаратурнага музея Янкі Купалы.
*"Чытач "Нашай Нівы" з хутара Далібор".*

**Сяргей Панізнік**, вучоны сакратар Літаратурнага музея Янкі Купалы
*"Іларыён Свянціцкі піша ў "Нашу Ніву".*

Заяўленыя выступленні ў дыскусіі:
**Мікола Ермаловіч** (Мінск), **Сяргей Дубавец** (Мінск), **Сяргей Тарасаў** (Мінск), **Любоў Тарасюк** (Мінск), **Генадзь Кісялёў** (Мінск), **Сакрат Яновіч** (Польшча), **Валерый Максімовіч** (Мінск), **Ірына Багдановіч** (Мінск).

16.00-18.00

Старшынствуюць: прафесар **Вячаслаў Рагойша** (Беларусь),
дацэнт **Аляксандра Станкевіч** (Беларусь).

**Уладзімір Гніламёдаў**, член-карэспандэнт АНБ, прафесар, намеснік дырэктара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АНБ (Мінск)
*"Наша Ніва" і беларуская палітычная традыцыя".*

**Аляксандр Баршчэўскі**, доктар філалогіі габілітаваны, прафесар, загадчык кафедры філалогіі Варшаўскага універсітэта (Польшча)
*"Карэспандэнты "Нашай Нівы" з Беласточчыны".*

**Ванда Бароўка**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Віцебскага дзяржаўнага універсітэта
*"Наша Ніва" і развіццё беларускай прозы пачатку XX ст."*

**Мікалай Трус**, загадчык аддзела Літаратурнага музея Максіма Багдановіча
*"Да пытання развіцця беларускай паэзіі нашаніўскага перыяду ў агульнаславянскім літаратурным кантэксце".*